Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 6 Вільня, Пятніца 15-га красавіка 1927 г. Год 1

Культурнае змаганьне.

Пасьля разгрому ўрадам „Грамады“ вёску нашу засыпалі розныя чыста палітычныя часопісі і лісткі ў беларускай мове, выдаваныя ці то зьнюхаўшыміся з польскай буржуазіяй беларускімі партыямі (сельсаюьнікамі, хадэкамі), ці рознае масьці і гатунку „полёнофіламі“ (Павлюкевічамі, Валэйшамі), ці ўрэшце самімі палякамі („Беларускі Дзень“). Усе гэтыя часопісі і лісткі маюць адну супольную ім усім мэту: перахапіць *палітычныя ўплывы* на беларускія працоўныя масы, якія мела сярод іх „Грамада“.

Побач з гэтым дружным, аб'яднаным *палітычным* паходам буржуазных групаў на беларускую вёску—мы павінны адзначыць ня менш энэргічнае *культурнае* наступленьне на нашу вёску польскае дэмакратычнае інтэлігенцыі, якая хацела-бы захапіць у свае рукі кіраўніцтва культурным жыцьцём беларускага сялянства—ведама-ж, з мэтай апалячэньня яго. Да гэтага адкрыта прызнаўся ў нумары з 8 красавіка „незалежны дэмакратычны орган“ — „Kurjer Wileński“.

Нядаўна абшарніцкае „Słowo“ пісала, што галоўным пунктам польскае палітыкі ў адносінах да беларусаў мусіць быць *неперашкаджаньне польшчыцца* тым беларусам, якія гэтага *самі хочуць*. Паны дэмакраты йдуць далей: яны заклікаюць усё польскае грамадзянства ў Заходняй Беларусі згуртавацца і стварыць адзіны культурны фронт — дзеля шырэньня польскіх культурных уплываў сярод беларусаў, *не чакаючы на тое, што тыя самі захочуць польшчыцца*...

Больш таго: ужо стварылася адумысная арганізацыя—таварыства „Культура“. Таварыства гэнае, як піша „Kur. Wil.“, не стаўляе ніякіх нацыянальных абмяжаваньняў“ для сваіх сяброў, ласкава прымаючы і беларусаў дзеля... працы над пашырэньнем *польскае культуры*. Бо што іменна аб гэта йдзе тут справа, паказуе друкаваньне новазакладзеным таварыствам культурна-асьветнае часопісі пад назовам „Kultura“ — *папольску*!

Дык так: у палітычнай рабоце можна карыстацца беларускай мовай і беларускім друкам; у культурнай — не! Бо-ж ясна, што польскае грамадзянства хіба найменш зацікаўлена ў тварэньні культурных цэннасьцяў — культурнае стравы ў роднай мове беларускае сялянскае масы...

Калі на нейкай тэрыторыі сустракаюцца ўплывы дзьвюх нацыянальных культур, дык паміж імі няўхільна ўзьнімаецца змаганьне. Перамога тая, якая бліжэй масам, ды якая выяўляе больш жыцьцёвае творчае сілы. Дык ясна, што на гэты новы культурны паход польскае дэмакратыі на Заходнюю Беларусь мы павінны даць належны адпор.

Але як?

А вельмі проста: творачы свае культурныя цэннасьці, сваімі сіламі ды ў роднай мове здаваляючы імкненьне масы да сьвятла. І чым мацнейшае будзе наступленьне чужое культуры, тым больш мусім напружаць мы свае творчыя сілы дзеля *разьвіваньня і ўзбагачаньня роднае культуры*. І той факт, што распачатае наступленьне вядуць у нас „вярхі“ польскага грамадзянства, а ў нашай культурнай працы прымаюць чыннае ўчасьце працоўныя масы места і вёскі, — гэты факт суліць нам блізкую перамогу на культурным фроньце змаганьня за нашае нацыянальнае істнаваньне.

Дык хай грамадзянства нашае дасьць належную ацэнку ўсей тэй масе раскіданых па краю палітычных лісткоў і часопісяў, якія ў роднай мове нясуць нам атручаную страву, — хай усе свае сілы пакіруе *на культурны фронт*, на якім канцэнтруюцца сяньня сілы нашых супраціўнікаў!

Водгук разгрому Грамады у англійскім парляманьце.

Карэспандэнт „Кур. Варш.“ тэлеграфуе з Лёндану:

„У англійскім парляманьце работніцкі пас. Вэджвуд заінтэрпэляваў Чэмбэрлена ў справе разгрому польскім урадам беларускай партыі, пытаючыся, ці Ліга Народаў не займецца гэтай справай?!

„Міністар адказаў, што на гэтыя запытаньні ён нічога ня мае адказаць“.

„Трагедыя Польшчы“.

Пад такім загалоўкам „Роботнік“ піша:

„Адна з найцяжэйшых вінаў, якія мы закідаем пасьля маёвану польскаму ўраду, гэта—поўная адсутнасьць якіх-небудзь пачынаньняў у галіне справаў нацыянальных меншасьцяў. Зьбіраецца ад часу да часу так званая Камісія экспэртаў. Але яе нарады не даюць ніякіх рэзультатаў: па ўсходніх ваяводзтвах шалее адміністрацыйная самаволя; школьныя законы якія так мала даюць меншасьцям і тыя ня выконываюцца; „упраўляюць“ паветамі часта такія фігуры з фантастычнай байкі, як той староста з Глыбокага, які навет у вершах польскай паэткі Канапніцкай знайшоў „падбураньне да клясовай ненавісьці“...

„Замест спадзяваных рэформаў, прыйшлі масавыя паліцэйскія рэпрэсіі. Рэакцыйныя часопісі ў Вільні ўпіваюцца шчасьцем пабеды, расьпісываючы „ліквідацыю Грамады“, забыўшыся аб тых масах крыўдаў, надужыцьцяў і несправядлівасьцяў, якія зьвязаны з гэтай „ліквідацыяй“, дый якія зроблены тысячам беларускіх сялян...

„Змарнаваны безнадзейна, беспаваротна цэлыя 11 месяцаў. Цяпер палажэньне ў гэтай галіне (меншасьцёвай справы) — горшае, чым было год назад. Урад ня выявіў ані пляну, ані нарысу пляну, ані якой-колечы творчай мысьлі. Дык вось, гэтае бяссільнае, страўсавае абмінаньне гэтай справы робіцца запраўднай трагедыяй Польшчы. Трэба папросту біць у званы на трывогу, бо мы ўсё глыбей ды глыбей загразаем у тым самым балоце, якое праглынула старую (шляхоцкую) Рэчпаспалітую“...

Часамі, трэба прызнаць, пэпээсы — на ўсялякі выпадак — кідаюць трафныя думкі... Шкада толькі, што яны—пры сьцьверджаньні „бяссільля“ ці злой волі Камітэту экспэртаў—забыліся тут-жа дадаць, што ўсе сябры гэнага Камітэту бяз вынятку — пэпээсы... — П. Голувко—актыўны, п. Васілеўскі—таксама чынны, п. Левэнгэрц—былы актыўны, цяпер—„сымпатык“...

Радавая прэса аб польскай палітыцы.

Нядаўна польскі міністар Залескі надрукаваў у „Роботніку“ сваю „гутарку з нашым супрацоўнікам“, у якой выясьняў мэты польскай палітыкі адносна да ССРР і балтыцкіх дзяржаваў, дый наагул — у справах „Усходняй Эўропы“.

У „гутарцы“ мін. Залескі, — у сувязі з маючымі ўжо распачацца ў Маскве перагаворамі з радавым урадам — аб палітычным і гаспадарчым трактатах, — запэўняў сьвет, ССРР і балтыцкія дзяржавы аб мірнай палітыцы Польшчы дый аб шчырасьці яе жаданьняў паразуменьня з „Усходам“... Прыступаючы да перагавораў, пасьля падпісаньня радава-латвійскага трактату, на падставе, прапанаванага радавай дыпляматыяй прынцыпу паасобных „пактаў“, міністар аднак жа штосьці нявыразна казаў аб тым, што Польшча хоча заключыць з ССРР нейкі агульны трактат балтыцкіх дзяржаваў (на чале з Польшчай).

Гэта выклікала вострыя водгук у радавай прэсе.

„Известия“ рэзка падчырківаюць „двузначнасьць і супярэчнасьць“ заяваў польскага міністра. „Але вось паўрадавы „Голос Правды“ — дык той зусім выразна раскрывае сэнс гутаркі міністра. Польскае Міністэрства замежных спраў, аказываецца асталося на старой пазыцыі — супольных перагавораў Польшчы і балтыцкіх дзяржаваў, з аднаго боку, і ССРР з другога“... Дык радавая газэта папросту ня верыць у шчырасьць жаданьня польскага ўраду, які распачаў перагаворы, — давясьці іх да канца... „Дэклярацыі з боку Польшчы аб яе гатоўнасьці паразумецца з ССРР зьяўляліся на сцэну кожны раз, калі Польшча мела на Захадзе тыя ці іншыя палітычныя труднасьці да перамогі“... Дык Рады вельмі мала верацъ у новую дэклярацыю польскага міністра“... „Калі і гэтая дэклярацыя мае на мэце толькі настрашыць кагосьці на Захадзе, дык ССРР у гэтай дыпляматычнай гульні ўчасьця ня возьме“...

Якія-ж гэта „палітычныя заданьні“ ці „затрудненьні“ мае ў сучасны мамэнт Польшча на Захадзе, што пачала — „страшыць“ яго магчымасьцю паразумецца з Усходам? Ня трэба вялікага спрыту, каб зразумець, што мае на думцы радавая прэса. Амаль ня што-дня ідуць у Варшаве нарады ўсіх польскіх уплывовых чыньнікаў між сабой і з прадстаўніком амэрыканскіх банкіраў (пэўна-ж не бяз учасьця ўсемагутнага англійскага пасла)! — у справе пазыкі... Як гэта ні дзіўна, перагаворы гэтыя ў Варшаве неяк зьвязаны з перагаворамі, якія распачаліся ў Маскве... І на гэтай сувязі спрытныя польскія палітыкі могуць згуляць добрую ігру, якая пэўна-ж, як кажуць расейцы, — варта спаленых пры ёй сьвечак“...

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Лекцыі для вёскі.

З усіх канцоў краю, дзе толькі пазакладаліся гурткі Т-ва Беларускае Школы, бібліатэкі-чытальні і інш., — ідуць весткі аб тым, што вёсцы на-гвалт патрэбна шырэйшая пазашкольная праца. Патрэбны перадусім рознага роду асьветныя курсы, вячорныя школы граматы, дый прынамся хоць ад часу да часу папулярныя лекцыі — як з галіны беларусазнаўства, так і агульна-асьветнага зьместу. Аднак, толькі ў вельмі рэдкіх выпадках на мясцох аказваюцца культурныя сілы, якія могуць здаволіць гэту патрэбу вёскі і даваць ей культурную справу ў роднай мове.

Як-жа памагчы гэтай бядзе? Рассылаць лектараў на правінцыю ані Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы, ані акруговая Управа Т-ва — ня ў сілах: на гэта патрэбны цэлы штат лектараў і значныя грошы на разьезды іх, што пры сучасным матэрыяльным палажэньні беларускага грамадзянства пад Польшчай — невыпаўніма. Вось, мы і хочам парадзіць нашым вясковым культурнікам, як можна хоць у нейкай меры замяніць прыезных лектароў і наладзіць у сябе на вёсцы сыстэматычнае чытаньне лекцыяў.

Мы ўжо друкавалі справаздачу аб закладзеным месяц назад журнале месячніку пад назовам „Родныя Гоні“. Журнал гэты мае на мэце іменна і выключна працу культурна асьветную. Зьмяшчаныя ў ім стацьці — гэта-ж і ёсьць тая культурная страва, якая так патрэбна сягоньня вёсцы.

Мала таго. У Вільні, у Цэнт. Гуртку Т-ва Белар. Школы, у працягу ўсяе сёлетняе зімы чыталіся, дый цяпер чытаюцца, папулярныя лекцыі — як па беларусазнаўству (аб мове, літэратуры, гісторыі беларускай), так і па розных прадметах агульнага ўзгадаваньня. Лекцыі гэтыя чытаюцца найлепшымі нашымі сіламі—спэцыялістамі ў гэных прадметах. А пасьля лектары гэтыя свае лекцыі поўнасьцю, ў скарочаным відзе запісаваюць і даюць у рэдакцыю „Родных Гоняў“ дзеля надрукаваньня. Такім чынам усё тое, што даецца на лекцыях нашаму грамадзянству ў культурным цэнтры нашага краю — Вільні, разносіцца ў друкаванай форме на ўсенькім краю і можа быць выкарыстана на вёсцы дзеля чытаньня тамака такіх жа публічных лекцыяў. Дзеля гэтага трэба толькі, каб заклаўся гурток Т-ва Беларускае Школы, ды каб знайшлося колькі ахвочых людзей, і вось у кожную суботу ці нядзелю вёска можа слухаць тыя самы лекцыі, якія віленскае грамадзянства слухала месяц раней.

Тут хочам затрымацца толькі на адным мамэньце гэткага спосабу працы на вёсцы: на розных публічных абходах—літэратурных, грамадзкіх і іншых. Было-б вельмі важна і пажадана, калі-б вёска ня ждала месяц ці каля таго на атрыманьне ўжо прачытанае ў Вільні ў часе абходу лекцыі ці дакладу, а мела-б патрэбны матэрыял загадзя, ды гэтак магла-бы далучыцца да абходу ў той самы дзень, у які яго спраўляюць у сталіцы краю. Дык у такіх выпадках рэдакцыя „Родных Гоняў“ мусіла-б паразумецца з віленскім лектарамі і атрымаць ад іх загадзя хаця-бы скарочаны зьмест іх лекцыяў і дакладаў, празначаных на сьвяткаваньне. Тады ўся справа абходаў на вёсцы была-б вырашана зусім памысна.

Як нас інфармуюць, такі праект рэдакцыя „Родных Гоняў“ мае адносна да прыпадаючых на 25 мая дзесятых угодкаў сьмерці Максіма Багдановіча. У Вільні абход вызначаны на 28 мая — ў суботу, калі людзі вальнейшыя ад працы. І мы заклікаем нашых вясковых культурных работнікаў выкарыстаць матэрыял, які будзе зьмешчаны аб Багдановічу ў маёвым нумары „Родных Гоняў“, ды наладзіць усюды памінальны абход на той-жа дзень—28-га мая.

А. Н—а.

«Kurjer Warszawski» аб магчымасьці вайны.

Парыжскі карэспандэнт „Кур. Варш.“ піша, што Эўропа вельмі ўстрывожана магчымасьцю выбуху вайны — сьпярша ў Кітаі, а пасьля і ў Эўропе. Як толькі кітайскія падзеі выклічуць паход ССРР на Манчжурыю, ўмяшаецца Японія. Англія рыхтуецца да сьмяротнай барацьбы з ССРР, заклікаючы да коаліцыі Францыю, Амэрыку, Італію. А гэта можа адбіцца ў Эўропе—рашучай перагрупіроўкай дзяржаваў. Нямеччына-ж, захоўваючы нэйтралітэт, у апошні мамэт выступіць з сваімі варункамі ды трэбаваньнямі... А гэта можа зьмяніць ня толькі групіроўку, але і—тэрытарыяльны склад раду новастворaных дзяржаваў.

У Сойме.

Калі мае быць склікаты Сойм?

Газэты пішуць, што Сойм мае быць скліканы на кароткую веснавую сэсію ў канцы красавіка. Сойм мае ратыфікаваць рад міжнародавых трактатаў, якія распачаў разглядаць перад роспускам, але скончыць ня даў яму ўрад. Апрача таго, Сойм мае зацьвярдзіць амэрыканскую пазыку.

Паводле чутак, якія падае „Дзен. Віл.“, урад быццам зьбіраецца зацьвярдзіць пазыку сам, бяз Сойму,—на падставе паўнамоцтваў, хаця Канстытуцыя выразна кажа, што замежныя пазыкі ня могуць быць узяты бяз згоды Сойму.

Цікаўна, што „канстытуцыйная апазыцыя“ ў асобе п. Строньскага з „Варшавянкі“ ўслужна дабірае „юрыдычныя“ довады, якія быццам доказываюць, што ўрад мае гэтае права—бяз Сойму...

Ці дазволіць урад Сойму скончыць працу над распачатымі праектамі—аб самаўрадах, зьменай выбарнага закону і інш.—вялікае пытаньне.

БАРАЦЬБА У КІТАІ.

Адказ Пэкінскага ўраду на ноту СССР.

Пэкінскі ўрад (чытай: Чанг-Тсо Л'н) даў адказ на ноту радавага ўраду, якая пратэставала проці нападаў на радавае пасольства ў Кітаі. У адказ Пэкін піша, што ў радавым пасольстве знойдзены дакумэнты, якія сцьвярджаюць падрыхтаваньне паслом замаху на пэкінскі ўрад і г. д

Пішуць (ведама — англійцы), быццам у насольстве знойдзены квіты міністра замежн. спраў Кантонскага ўраду — у тым, што ён атрымліваў па 15.000 даляраў у тыдзень ад радавага ўраду—„на свае патрэбы".

Чанг-Тсо-Лін абвясьціў вайну СССР?

З японскіх крыніцаў паведамляюць, быццам Чанг-Тсо-Лін абвясьціў вайну СССР. Пацьверджаньня гэтай весткі яшчэ няма.

Японія гарантавала Чанг-Тсо Ліну падтрыманьне.

Англійскія газэты пішуць, быццам Японія гарантавала Чанг-Тсо-Ліну свае падтрыманьне на выпадак нападу СССР на Манчжурыю.

Дзіва, што гарантавала: бо ж японскія капіталы настолькі ўжо ўгнязьдзіліся ў Манчжурыі, што Японія амаль-што лічыць ужо гэты край сваім! Прынамся распараджаецца ў ім, ня гледзячы на „дыктатара", як хоча...

Пасьпехі паўночнай арміі?

Пэўна ж з англійскіх крыніцаў ідуць весткі аб пасьпехах паўночных арміяў у баёх на паўночным беразе ракі Ян-Тсэ. Быццам войска Чанг-Тсо Ліна само перайшло ніжэй кантонцаў праз раку—на яе паўдзённы бераг і гэткім манэврам зайшло ў тыл кантонскай арміі. Дзеля гэтага кантонскія войскі, якія перайшлі былі праз раку, пачалі сьпешна адступаць назад—на Шанхай. Быццам кантонцы аддалі Чанг-Тсо Ліну цэлы рад занятых перад тым местаў.

Калі гэта праўда, дык — няма нічога дзіўнага: Чангу даюць вялізарную масу аружжа і грошаў Японія і Англія, каб толькі—душыў вольнасьць кітайскага народу...

Новы старшыня партыі кітайскіх нацыяналістаў.

Партыя Куомінтанг (гэта значыць—нацыяналістаў - незалежнікаў) выбрала толькі-што новага старшыню—ведамага рэвалюцыянера Ва-Шінг-Вэя, які зьяўляецца прыхільнікам цеснага саюзу з СССР ды павадыром крайняга левага напрамку партыі.

Нота дзяржаў — Кантонскаму ўраду.

Англійскія крыніцы даносяць, што 10 красавіка саюзныя дзяржавы—Англія, Францыя, Італія, Амэр. Штаты і Японія — падалі кантонскаму ўраду супольную ноту, у якой пратэстуюць проці забіцьця сваіх грамадзян у Нанкіне. Аднак-жа нота зусім ня мае характару ўльтыматуму, як аб гэтым трубіла англійская прэса. Відаць, стараньні Англіі завастрыць канфлікт не дайшлі да скутку.— Дзяржавы яўна жадаюць злагоджаньня палажэньня.

Уладыслаў Грабскі аб „дыктатуры чужаземнага капіталу" у Польшчы.

Былы прэм'ер і мін. фінансаў Ул. Грабскі піша ў „Кур. Варш." аб тым, што фактычна варункі амэрыканскай пазыкі, на якія быццам ужо згадзіўся польскі ўрад, уводзяць у Польшчы „дыктатуру чужаземнага капіталу". Праўда, кажа ён, урад адкінуў устанаўленьне 4 чужаземных кантралёраў над сваей фінансавай палітыкай, згадзіўшыся толькі на аднаго сталага „наглядчыка",—але галоўная рэч у тым, што ўрад прыняў другі, больш важны варунак чужаземных банкіраў: абязаўся прыняць апрацаваны імі „плян усталеньня валюты". І вось, дзеля таго, каб сачыць за точным выкананьнем гэтага пляну, мае сядзець у Варшаве „наглядчык"...

Аўтар кажа, што тое, што цяпер у Польшчы хочуць зрабіць чужаземныя банкіры, тое явы зрабілі ўжо нядаўна ў Аўстрыі і ў Вэнгрыі, ды ў Нямеччыне. Але Польшча зусім не знаходзіцца, кажа Грабскі, у такім безнадзейным стане, у якім былі калісьці гэтыя дзяржавы. Дык яна можа выпрацаваць і правадзіць у жыцьцё свой уласны плян... Але сам аўтар кажа, што дагэтуль у Польшчы ніхто не працаваў над уласным плянам санацыі фінансаў. Ніхто, апрача самога Грабскага, які апрацаваў санацыю, каб пасьля праваліць яе разам з новай валютай. Новастворaная „Фінансавая Рада" сабралася штосьці адзін-адзіны раз, але ніхто навет не даведаўся, аб чым яна гутарыла. Сойм у гэтай справе маўчыць. Урад чакае. Прайшоў год, але аб „уласным пляне" нешта зусім ня чуваць.

Так піша сам Грабскі, зьбіваючы сам сябе лепш, чым які небудзь яго праціўнік. Але вось, раптам усе пачулі, што ёсьць ужо нейкі „плян", які мае быць выкананы, а над яго выкананьнем будзе „чуваць" амэрыканскі „наглядчык". Скуль-жа ўзяўся—ня з неба ж зваліўся! — гэты гатовы плян? Ясна, што гатовы плян—прывезены з Амэрыкі капіталістамі. На тое, відаць, і прыяжджаў у Польшчу праф. Кемэрэр.

Грабскі страшэнна крытыкуе плян Кемэрэра ды наагул—„гатовы чужаземны плян". Ен кажа, што—„ня трэба сьлепа слухаць чужаземных спэцыялістаў", забываючы, што сам першы выпісаў з заграніцы „фінансавы розум", якога, відаць, ня меў навет ён, геніяльны фінансіст, Грабскі. Забывае ён і тое, што правалілася ўся яго праца якраз затым, што ён не паслухаў пляну англійскага дарадцы Хільтона Юнга, але — перарабіў яго плян пасвоему.

Слушна кажа толькі Грабскі тое, што— пад відам правядзеньня пляну санацыі валюты—чужаземныя банкіры фактычна возьмуць пад сваю апеку і дыктатуру ўсё фінансава-гаспадарчае жыцьцё Польшчы. І тут — найвялікшая небясьпека. Бо-ж вось яны і іх агенты ўжо кажуць зусім адкрыта, што злоты павінен быць раз назаўсёды афіцыяльна і праўна зацьверджаны на роўні 9 за 1 даляр: аб „навароце да парытэту" (да роўня 5 зл. 18 гр.) ня можа быць ніякай мовы. Гэтым—на вечныя часы ставіцца... памятнік самаму п. Грабскаму, бацьцы гэтага злотага, ад якога асталася толькі палова яго пачатнай вартасьці. У сувязі з гэтым „абязцэненьнем" на палову злотага банкіры, гарантуючы пазыкай яго разьмен на золата, за гэта трэбуюць, як неабходнага варунку, — „спыненьня пратэкцыйнай вывазной палітыкі польскага ўраду"... Інакш кажучы, — амаль не адчыненьня вольнай брамы ў Польшчу для заграпічнага гандлю...

Гэта — якраз тое, чаго дамагаліся сусьветныя банкіры ў сваім знамянітым „Маніфэсьце" аб'яднанага капіталу... А гэта ж— сьмерць для польскай прамысловасьці...

Грабскі не дагаварывае да канца, ня робіць усіх вывадаў з праектаванай — за пазыку — „санацыі", але, што гэтая пазыка, калі яна будзе дадзена, — будзе дадзена пад варункам запраўднай фінансавай дыктатуры чужаземнага капіталу ў Польшчы, у гэтым аўтар не памыліўся...

Можна толькі дадаць, што фінансавая дыктатура ёсьць вельмі выгадная прылада для—дыктатуры палітычнай!..

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Кітайская вайна адбілася на... Беластоку.

З Беластоку пішуць, што кітайскія падзеі адбіліся на мясцовай ткацкай прамысловасьці вельмі шкодна. З Харбіна пішуць беластоцкім прамыслоўцам, што — з прычыны спадку кітайскай валюты — спыніліся ўсе паважныя апэрацыі з беластоцкімі фірмамі. Апрача таго, каля Харбіна пабудавана кітайская фабрыка тканіны, якая канкуруе з беластоцкімі купцамі.

Кракаўскі „Час" аб амэрыканскай пазыцы.

Добра паінфармаваная кракаўская газэта, орган кракаўскіх прафэсароў-кансэрватыстаў, якія цяпер увайшлі ў такую моду і сілу ў Польшчы (ня так даўно сам Пілсудскі заявіў, што ён — „кансэрватыста"), піша аб варунках, якія амэрыканцы ставяць Польшчы за пазыку. Трэба дадаць, што адзін з дэлегатаў, якія езьдзілі ў Амэрыку, кракаўскі прафэсар Кшыжаноўскі, — ужо даўно пісаў, што пазыку трэба браць, згаджаючыся на ўсе варункі: кантроль, дык кантроль— ня страшна! Пазыка, як піша прэса, мае быць — ці то 50 ці 70 мільёнаў даляраў.

„Час" піша:

„Між варункамі, якія накідаюць Польшчы амэрыканскія банкіры, стаіць варунак, каб з боку амэрыканскіх фінансістаў у Наглядную Раду Польскага Банку пасадзіць 4 прадстаўнікоў, якія-б мелі права кантролю над дзяржаўным бюджэтам Польшчы — у галіне падаткаў. „Ведама было, што проці гэткіх кантралераў у Польскім Банку рашуча запратэставаў старшыня банку Карпіньскі. Але „Час" сцьвярджае, што „на нарадзе ў Замку 7.IV Прэзыдэнт рэспублікі сам заявіў, што амэрыканскія варункі адносна да кантролю ня могуць быць прыняты, дый што Польшча можа абыйсьціся і без амэрыканскай пазыкі". Газэта піша што марш. Пілсудскі маўчаў, ня кажучы — ні за, ні проці кантролю.

Газэта піша, што „сярод усяго польскага ўраду зрабіўся перапалох. Бо ж мініністры Бартэль, Чэховіч, Залескі далі дэлегатам у Амэрыку згары ўжо згоду ўраду на гэты кантроль...

Дык у канцы — няведама, хто ўступіць: ці Польшча, ці амэрыканскія банкіры.

Весткі з Парыжу.

Газэты пішуць, што — паводле паў афіцыяльных даных — у Парыжу дасягнута паразуменьне між прадстаўніком амэрыканскіх банкіраў і дэлегатам ураду ў справе кантролю. Польскі ўрад быццам згадзіўся на кантроль, але кантралераў мае быць не 4, а толькі 3, дый то — адзін сталы а 2 „надзвычайныя", якія будуць прыяжджаць у Польшчу ў найбольш важных мамэнтах.

Кантроль над расходаваньнем пазыкі мае вясьці Польскі Банк, правільней — адна з яго камісіяў, якраз тая, у якой будзе сядзець гэты „наглядчык". Гэткім чынам мае быць загарантавана даверые заграпічнага капіталу да польскага ўраду.

Калі-ж, нарэшце, Польшча атрымае пазыку? П. Млынарскі мае надзею, што ўжо ў траўні першая рата будзе атрымана. Можа акурат—у дзень угодкаў „перавароту"?!...

Клапоты міністра зямельных рэформаў — аб абшарнікаў.

Па дакладу мін. зямельных рэформаў, рада міністраў разглядала праект дэкрэту аб заплаце абшарнікам за зямлю, забраную ад іх на карысьць асаднікаў. Гэтае адшкадаваньне мае быць выплачана білетамі Дзяржаўнага Скарбу, якія ў працягу 10 гадоў павінны быць аплочаны гатоўкай.

За падставу пры азначэньні вартасьці забранай зямлі прыняты дэкляроцыі, пададныя... самімі абшарнікамі! Бо-ж так, зразумела, найляпэй: каму лепш ведаць цану сваей зямлі, як не самаму яе ўласьніку?!...

Ня можа дагэтуль „зямельная рэформа" ў Польшчы ніяк вылезьці па-за абшарнікаў ды асаднікаў...

„На падставе канкардату з Рымскім Папай".

Польскі Япіскапат зьвярнуўся да польскага ўраду з дамаганьнем — вярнуць Каталіцкаму Касьцёлу на ўласнасьць усе тыя зямельныя маёнткі, будынкі і іншыя вялізарнай вартасьці маемасьці, якія калісьці належалі да Касьцёла, але былі або сканфіскаваны заборчымі ўрадамі, або — пастановай Устаноўчага Сойму аб'яўлены ўласнасьцю Польскай Дзяржавы. Польскія япіскапы прадставілі ўраду даўжэнны сьпісак гэтых маемасьцяў, якія ў сучасны мамэнт часткова падзелены, часткова заняты рознымі дзяржаўнымі ды грамадзкімі ўстановамі, якіх усіх цяпер трэба будзе выкідаць на брук... Спаўненьне нячуваных трэбаваньняў польскіх біскупаў запраўды, як піша „Роботнік", расхістала б дарэшты навет бюджэтную раўнавагу Польшчы... З свайго боку, біскупы заяўляюць, што яны толькі дамагаюцца таго, на што маюць „сьвятое права ўласнасьці", загарантаванае Польскай Канстытуцыяй ды — конкордатам з Рымскім Папай, уложаным слаўным Стан. Грабскім ды зацьверджаным Польскім Соймам...

Цікаўна толькі напомніць, што тыя-ж самыя польскія біскупы, якія цяпер трэбуюць з горла Польшчы сабе і „свае" землі і дамы, у першыя часы Польскай Дзяржавы, асабліва ж у часе бальшавіцкага наезду на Польшчу, калі трэба было заклікаць ў войска сялянскія ды работніцкія масы, шляхотна ахвяравалі ўсе зямельныя маемасьці Каталіцкага Касьцёла — на зямельную рэформу... Так зьмяняюцца часы і настроі каталіцкага кліру ў Польшчы.

Заграніцай.

Хто хоча ваяваць?

На паседжаньні „камісіі разбраеньня" прапазіцыя Францыі — аб агульным абмяжаваньні выдаткаў на армію — была адкінена галасамі **Англіі, Італіі і Японіі.**

А, здаецца, так яшчэ нядаўна якраз у гэтым быў зьмест — „англійскай тэзы разбраеньня".

Скончылі ці адлажылі камэдыю „разбраеньня"?

На паседжаньні камісіі Лігі Народаў у справе разбраеньня англійскі дэлегат Сэсіль рэзка скрытыкаваў ды адкінуў францускі

СОН ГАБРУСЯ.

Сонца ўжо даўно схавалася за бор, і ноч, нібы чорная коўдра, пакрывала ўсход. Пастухі папрыганялі з палёў.

Касцы і жнеі вярталіся да хаты, і адгалос іх песень ліўся далёка-далёка па лесе...

Прайшло з паўгадзіны, і зусім сьцямнела. Вёска патрошку стала засынаць... Толькі на двары сельскага савету чулася моцная гутарка...

— Браточкі,—гукаў Нічыпар, — гэта-ж людзі ноч расхапаюць, а мы ўсё спрачаемся..

Але яго словы ледзьве можна было распазнаць паміж той гамарні, якая цяпер тварылася на двары.

— Ну, ціха! Дайце мне сказаць колькі слоў,—абазваўся стары Тамаш, і стаў пасоўвацца на сярэдзіну грамады, якая чуць таўпілася на досыць такі шырокім двары, — я ўжо раней казаў, і цяпер кажу, што ня трэба зварочваць увагі на двух ці на трох чалавек, якія ня хочуць дапамагчы ў гэткім няшчасьці... Ці-ж ня сорам вось табе, Габрусь: ты можа яшчэ маеш леташні хлеб, але, скажу папраўдзе, яшчэ два-тры, а то і болей пудзікаў захована пад саломай, і сёлета, дзякуй богу, ураджаі добрыя і вось ты, шляхецкая твая натура, каб табе загінуць, ня хочаш даць колькі фунтаў тым няшчасным галодным людзям, якія цяпер зямліцу ды кару з дрэва ядуць?!. Ці ж ня грэх і ня сорам гэта, мужчыны?

— Мне дай слова, старшыня,—закрычаў Кузьма, чуць ня самы бедны селянін вёскі,— я сам галадаю, мне самому прыходзіцца йсьці ў людзей прасіць кавалак хлеба, а я бажуся перад усімі, што, як толькі сажну свой загон, першы прывязу сваю частку, каб паслаць туды, дзе ўсё сьпёка папаліла, і дзе тысячы людзей паміраюць ад голаду... Мне здаецца, што ўжо даволі нагукаліся, я раджу гэтак запісаць і ў прэтакол, што сход пастанаўляе: як толькі зьбяром з палёў хлеб, памалоцім, чым хутчэй выпаўнім харчовы налог і тады абяцаем, хто колькі можа, прынясём збожжа, бульбы і іншых харчоў вось сюды да старшыні на двор, для адпраўкі ўсяго туды ў галодныя губэрні, адкуль даносіцца плач галодных дзетак, і льюцца аж сюды рэчкаю сьлёзы іх бацькоў... Згодны, мужчыны?.

— Згодны! — закрычалі ўсё ў адзін голас...

— Мы апошняе пашлём тым гаротнікам, каб выратаваць ад бяды, — казаў барадаты Ахрэм,—бо ўсе жывём пад богам і ня ведаем, што нас чакае,—мо' на другое лета самі апынімся ў гэткім становішчы?.

— А хто не згаджаецца з гэткаю пастановаю?—запытаў старшыня.

— Я!... — адгукнуўся адзін толькі Габрусь.

— Ну і бог табе судзьдзя... Ты зусім ня нашай вёскі селянін, ты нейкі вырадак нашай прыгожай працоўнай сям'і...

Пачалі гаварыць мужчыны і, закурыўшы люлькі і папяросы, разышліся па хатах..

Габрусь таксама, нібы той воўк, моўчкі пасунуўся дамоў. Яму навет зрабілася і сорамна, што ён адзін не згадзіўся даць сваёй долі на дапамогу галадаючым людзям..

Ноч зусім ужо ахінула сваімі чорнымі крыльлямі вёску, і Габрусь быў вельмі рад, што яго ніхто не прымячае..

Гэтак, з нейкаю пакутаю ў сэрцы, ён дацягнуўся да хаты і сеў за вячэру...

Ну, што? На чым жа скончылася?—запытала яго жонка Адэля...

— На тым скончылася, — адказаў Габрусь,—што ўсе згадзіліся даць сваю частку дабра, каб паслаць туды, у галодныя край, а я не згадзіўся...

— І добра зрабіў! — залепятала яна. — Яшчэ што? Харчовы падатак бяруць, усё трэба купіць за збажынку, і яшчэ ахфяру нейкую рабі... Разумна зрабіў, што адмовіўся. Еж, Габруська, зацірачку,—сказала яна да мужа і лепятала далей, — гэта-ж сорам і так, што мы да гэтага дажылі, каб ты, Габрусь, што быў самым багатым шляхціцам на ўсю ваколіцу, і сёлета чуць—чуць сваім старым хлебам пракідаўся да новага ўраджаю... А памятаеш, як даўней у нас было, як яшчэ хлапцоў ды дзяўчат наймалі? Заўсёды паўзасека жыта заставалася на другі год... А колькі мы прадавалі?. Эх!... эх!—і, цяжка ўздыхнуўшы, яна пачала ўкладвацца спаць.

Габрусь таксама, вымянтаўшы дзьве місы заціркі, улёгся спаць, але думка аб тым, ці добра ён зрабіў, што адмовіўся даць хлеба галодным, не пакідала яго, і ён доўгі час ня мог заснуць...

Урэшце сон летняй кароткай ночы яго змарыў, і ён пачаў храпсьці, ды гэтак моцна, нібы хто яго душыў і не даваў супакойна дыхаць...

І вось сьніцца Габрусю страшны, страшны сон... Нібы ён блукае па нейкаму выпаленаму сонцам полю і шукае сваёй палосы... Пасьля знаходзіць, і што ж?!. Там, дзе ўвосень зелянела густая шаўковая рунь, дзе вясною сэрца яго было поўна радасьці, гледзячы на сваю шырокую і доўгую палоску, якая хвалявалася, як мора, і шаптала яму аб вялікім ураджаі, цяпер ён там ня можа знайсьці ніводнага каласка, ніводнай зялёнай травінкі. Усё пажоўкла, усё пачарнела, і нібы ад таго вогнішча нясе нейкім пахам даўнейшага дыму і чаду... Габрусь падае на калені на гэтай выпаленай палосе, на якую праз усю вясну і лета капелька дажджу ня ўпала, і горкімі сьлязьмі мочыць пагарэлыя саломкі каласоў, лісты пажоўклай травіны...

Ідзе ён далей і бачыць, што аўсы і ячмені таксама зваліліся на зямлю, а рацічныя бульбы завяла, пахілілася ў барозны, якія глыбокімі шрамамі выглядаюць на гладкім паленым полі... Габрусь ад сьлёз і ад жалю бяжыць сам, ня ведаючы куды. Ён забягае ў гай і бачыць, як без пары пажоўклі лісточкі на дрэвах, і чуе, як жаласна цыркаюць і пішчаць птушачкі, шукаючы лужынкі вады, каб прагнаць смагу... Але бедныя не знаходзяць і на вочах Габруся кідаюцца і паміраюць ад страшэннай сьпекі...

Вось раптам чуе ён нейкае страшнае жалобнае рыканьне... Ён выходзіць на балота і бачыць, як худыя, зусім змучаныя кароўкі грызуць сухі, выпалены сонцам мох і кусты багуну... Яны рыкаюць нейкім скрабучым за сэрца голасам, равуць, шукаючы сырую травінку, шукаючы выгар, дзе можна было-б глынуць хоць адну капельку гразкай вады...

І не знаходзячы, тут-жа са страшным рыканьнем туляцца да дрэва і, грызучы бяросту, ліжучы яе языком, застаюцца ляжаць назаўсёды...

Габруся пачынае разьбіраць нейкі страх... Ён ня можа знайсьці сабе месца... Але раптам якаясь невядомая сіла пераносіць яго ў сваю хату... Ён пераступіў парог і зжахнуўся...

Бачыць на ложку хворую і высахшую, белую, як палатно, жонку... Яна працягвае да яго свае худыя кастлявыя рукі і канаючым голасам шэпча: „Ратуй, Габруська!. Расінка праз два тыдні ня была ў роце... хлеба кавалачка два тыдні ня бачыла... з голаду і смагі паміраю... Ратуй мяне... Ратуй сваіх дарагіх маленькіх дзетак"...

Габрусь ад перапалоху адхіляе сваю галаву на кут... І вось... бачыць, у куточку сядзяць яго трое маленькіх дзетак... Яны апухлі і азызьлі з голаду, зусім не падобны да тых вяртлявых скакуноў, якімі ён бачыў іх раней...

Усе трое, прытуліўшыся адно да другога, яны ціханька плачуць... Яны грызуць

праект разбраеньня, як—залішне радыкальны. Адказываючы яму, француcкі дэлегат сацыяліст Бонкур заявіў, што з свайго боку Францыя ня можа прыняць англійскай прапазіцыі—абмяжаваньня францускага флёту. Тады старшыня камісіі запрапанаваў адлажыць на даўжэйшы час наагул працу камісіі.

Запраўды-ж, пара ўжо скончыць гэтую агідную ды скандальную забаву ў „разбраеньне“ — у той час, калі тыя-ж дзяржавы, якія ў Жэнэве вядуць пекныя гутаркі аб „спыненьні небясьпекі вайны“, фактычна распачалі ўжо страшэнную, агідную вайну процi вызваляючагася кітайскага народу!..

Міжнародавая гаспадарчая канфэрэнцыя.

4-га траўня мае распачацца ў Жэнэве міжнародавая гаспадарчая канфэрэнцыя. Канфэрэнцыя, у якой прымуць учасьце некалькі дзесяткаў дзяржаў усяго сьвету, мае працаваць каля 3 тыдняў. Адных толькі паўнамоцных дэлегатаў мае быць каля 200, ня лічучы розных экспэртаў ды спэцыялістаў.

Літва хоча весьці перагаворы з Польшчай?

Англійскія газэты падалі сэнсацыйную вестку, быццам літоўскі ўрад згадзіўся распачаць афіцыяльныя перагаворы з Польшчай у справе палітычнай і гаспадарчай умовы. Ці запраўды англійскаму паслу, які сядзеў у апошнія часы ў Коўні, удалося націснуць так моцна на літоўскі ўрад, — пакуль-што пацьвярджэньня няма.

Магчымыя зьмены ў літоўскім урадзе.

„Усходняе Агенцтва“ наказуе аб чутках з Коўны—у справе магчымых перамен у літоўскім урадзе, у склад якога быццам увайшлі-бы і людоўцы, а навет людоўцы-сацыялісты, якія цяпер ...лічацца амаль не „камуністамі“!..

Роспуск літоўскага Сойму—дыктатура ў Літве.

„ПАТ-а“ паведамляюць з Коўні, быццам Вальдэмарас падпісаў дэкрэт ба разгоне Сойму. Спадзяюцца афіцыяльнага абвяшчэньня дыктатуры і масавых арыштаў.

Ліквідацыя літоўскага прадстаўніцтва ў Лізе Народаў.

Літоўскі ўрад зьліквідаваў сталае прадстаўніцтва Літвы ў Лізе Народаў.

У справе перагавораў у Парыжу.

Француска-радавыя перававор[illegible] ў Парыжу, як сьцьвярджае ўжо афіцыяльна францускі ўрад, далі зусім рэальны рэзультат. Францускае міністэрства замежных спраў паведамляе, што пратакол, які азначае агульныя пункты будучага паразуменьня, ужо падпісаны абедзьвюма дэлегацыямі. Астаецца толькі падробна ўстанавіць разьмеры штогодных узносаў з боку Радаў—на сплату прызнанай сумы даўгоў, а таксама разьмеры тых крэдытаў, якія Францыя прынцыпова згадзілася даць СССР. Аканчальны дагавор мае падпісаць сам Чычэрын, які будзе варачацца дамоў праз Парыж.

Гэткім чынам радавай дыпляматы ўдалося дабіцца пэўнага аддзяленьня Францыі ад Англіі ў вельмі важны для СССР мамэнт. Толькі-што англійская прэса пісала, што Англія ня спыніцца перад крайнімі мерамі, каб толькі перашкодзіць падпісаньню паразуменьня між Францыяй і СССР, а асабліва — таму, каб Францыя дала якія-небудзь крэдыты Радам.

Шпіёнская арганізацыя ў Парыжу.

У Парыжу раскрыта паліцыяй шпіёнская арганізацыя. Яна быццам мае 100 сяброў, якія займаліся здабываньнем розных ваенных сакрэтаў Францыі — на карысьць Масквы. Арыштаваны 2 агенты: літоўскі студэнт Гротвіцкі ды нейкі мастак Бэрнштэйн.

13-ты Усесаюзны зьезд Радаў у Маскве.

10 красавіка распачаўся ў Маскве 13-ты Усесаюзны зьезд Радаў. Усяго зьехаліся 1403 дэлегаты, з якіх 418 мае дарадчы голас. Старшынёй зьезду выбраны **Калінін.**

Адчыніўся зьезд жалобным маршам — у памяць забітых барацьбітаў за вызваленьне Кітаю. Пасьля з вялікім дакладам аб сучасным становішчы СССР, аб яго гаспадарчым стане і міжнародавым палажэньні ў сувязі з здарэньнямі ў Кітаі выступіў **Рыков.**

Рыков заявіў, што ўся віна за кітайскія крывавыя падзеі падае выключна на сусьветных імпэрыялістаў, а перадусім на самага прагавітага ды наглага з іх—Англію. Англія цяпер усімі сіламі правакуе вайну Радаў з Паўночным Кітаем. Яна дабілася ўжо таго, што радавы ўрад сарваў зносіны з Пэкінскім урадам—у знак пратэсту проці нячуванага нападу на радавае пасольства ў Пэкіне. Рыков сьцьвярдзіў, што „СССР—дзяржава, якая ня выслала ніводнага жаўнера на кітайскую тэрыторыю. Правакацыйныя здарэньні ў Пэкіне былі арганізаваны — у поўным паразуменьні з пасламі замежных дзяржаў. Цяпер некалькі дзяржаваў ужо заявілі, што зусім не прылажылі сваей рукі да гэтага ганебнага дзела. „У лік апошніх дзяржаваў не ўваходзяць ані Англія, ані Італія“... „Нас хочуць папхнуць на аружнае ўмяшацельства ў кітайскія падзеі, але мы ня пойдзем на гэтую правакацыю“. На яе мы адкажам—„рашучай гатоўнасьцю к міру“.

У гаспадарчым аглядзе Рыков даў вельмі цікаўныя лічбы ўзросту дабрабыту СССР. Урад мае будаваць цэлы рад новых чыгункавых шляхоў. Пасеўная плошча СССР павялічылася на 5 проц. у параўнаньні з даваеннай. Праўда, якасьць пасеваў крыху меншая, чым да вайны: усяго збожжа зьбіраецца на 8 проц. менш, як да вайны, а прадажа хлеба сялянствам на рынак зьменшылася на 20 проц. Залішне павольна йдзе праца ўпарадкаваньня новага зямельнага ладу: дагэтуль зусім устроена на зямлі 12 проц. хлебаробаў. Дык справа гэтая ставіцца ўрадам, як „баявая задача“, у першую чаргу ў гэтым годзе.

Цяжка йдзе адбудова „конскага інвэнтару“ ў сельскай гаспадарцы. Набываньне сялянствам сельска-гаспадарчых машынаў ідзе значна хутчэй. Машыны масова даюцца напавер. У 1926 годзе машынаў адпушчана ў тры разы з лішкам больш, чым у 1923 г.: аж на 80 мільён. рублёў. Адных трактараў у 1926 г. было 14 тысяч штук, што йшчэ страшэнна мала.

Далейшую частку дакладу Рыкава заняў бюджэт СССР.

Нацыянальная сьвядомасьць і шовінізм.

Прыналежнасьць чалавека да тае ці іншае нацыі азначана самаю прыродаю. Чалавек можа па свайй волі зрачыся свае нацыянальнасьці і лічыць сябе нацыянальна саўсім ня тым, кім ён ёсьць праз свае нараджэньне. Гэта найчасьцей бывае цераз прыняцьце чалавекам чужое культуры, г. зн. культуры не таго народу, з якога ён паходзіць, а якога-небудзь іншага, культурна вышэйшага.

Усе народы маюць перад прыродаю роўнае права на істнаваньне, аднак ня ўсе яны роўнымі перад ёю зьяўляюцца. Таму, што адны народы больш перамаглі прыроду, збудавалі сваё жыцьцё выгадней за іншых, а найчасьцей, паняволіўшы г. званыя слабейшыя народнасьці, дабіліся гэтага выгаднейшага палажэньня коштам гэтых паняволеных.

Нявольнікам чалавек робіцца духоўна, утраціўшы пачуцьцё свае нацыянальнае вартасьці. Але калі гэтае пачуцьцё пераходзіць у яго ўжо й меру, калі чалавек усё стараецца бачыць толькі цераз свае нацыянальныя акуляры, дык часта-густа пачынае ён ненавідзець навет і тое добрае, што зьяўляецца культурным здабыткам не яго нацыянальнасьці. Горш таго — чалавек, пачаўшы ненавідзець іншага чалавека за тое толькі, што той не належыць да таго самага народу, а да іншага, пачынае ўжо заплюшчываць вочы на ўсё тое і нядобрае, што ёсьць сярод роднага народу. Гэткае пачуцьцё завецца шовінізмам. Дзеля таго, што няма на сьвеце нейкіх сьвятых, ідэальных народаў. Усе людзі—людзі.

Забойчыя для чалавечага росквіту, для разьвіцьця агульналюдзкае культуры на зямлі, крывавыя войны заўсёды дасюль хітра выклікаліся панаваўшымі клясамі розных нацыяў, дзякуючы цемнаце масаў кожнага, агулам бяручы, народу. Усё выхаваньне гэтак-званых народных нізоў рабілася так, каб пасеяць у душы іх ненавісьць да іншых нацыяў і разам надмерную нацыянальную гордасьць і шовінізм. Гісторыя вучыць нас, што нізы часта лілі на войнах сваю кроў і накладалі галовамі саўсім не за свае народныя інтарэсы, а проста за ўкрытыя ад іх інтарэсы іхніх валадароў. Падчас вайны раздувалася самая страшэнная нацыянальная ненавісьць. У ворагу стараліся ня бачыць нічога людзкага.

Нацыянальная-ж барацьба, як і ўсякая іншая барацьба чалавека за істнаваньне, можа зьвясьціся з зямлі толькі тады, калі ніхто на ёй ня будзе прыгнятацца і праследавацца за сваю нацыянальнасьць. Іначай кажучы, калі людзі перабудуюць сваё жыцьцё на іншы справядлівейшы лад, калі ніхто ня будзе на зямлі паразытам, жывучы коштам іншага чалавека, а толькі коштам свае ўласнае працы. Лепшыя з людзей даўно ўжо боруцца за гэткі вось справядлівейшы лад на зямлі, збудаваўшы цэлую навуку — соцыялізм.

І ў наш час сярод людзей паўстала саўсім натуральная клясавая варожасьць. Працоўныя клясы адносяцца варожа да клясаў непрацоўных. Гэтыя апошнія з пагардаю глядзяць на людзей працоўных, як на нейкія ніжэйшыя стварэньні. І гэтая ўзаемная ненавісьць людзкая ня зьнікне таксама датуль, пакуль істнавацімуць: абшарнікі—і сяляне, фабрыканты ды гандляры і работнікі.

Але, калі мы глянем на жыцьцё простым людзкім вокам, дык убачым, што самі па сабе працоўныя людзі ніколі ня могуць быць ворагамі адзін аднаму. Прыкладам, у нашых беларускіх лясох на лясных работах вельмі шмат мы спатыкаем работнікаў з праўдзівае Польшчы, з-пад Варшавы, Седлеца, ці Ломжы. Яны працуюць у лесе таксама, як і нашыя беларусы, зарабляюць свой гаротны кавалак хлеба, і ніхто з беларусаў ім з рота яго не выдзірае. Ясна, што мы й ня можам мець ненавісьці да паляка селяніна-гарапашніка або фабрычнага работніка-пролетара.

Сьвядомасьць свае прыналежнасьці да тае ці іншае нацыянальнасьці нікому не дае маральнага права душыць другога чалавека за тое толькі, што ён нацыянальна іншы. Усім людзям аднолькава сьвеціць сонца, усім аднолькава служыць прырода, трэба толькі ўмець ёю карыстацца і збудаваць чалавецкае жыцьцё так, каб ня было паміж людзьмі народаў-крыўдзіцеляў і народаў-нявольнікаў. Зямля аднолькава носіць на сабе ў сусьветным прасторы ўсіх людзей: і нас з белаю скураю, і чорнаскурых або нэграў, і жоўтых кітайцаў, і чырвоных індыян.

Дык, растучы нацыянальна, культурна разьвіваючыся, мы павінны старацца не захварэць на сьляпую нацыянальную самапэўнасьць, на тое, што гэтак раздуваюць сягоньня сярод польскіх народных масаў паны разам з клірам (духавенствам) і што яны завуць „нацыянальным эгоізмам“ ці, як па іхняму, „эгоізмэм народовым“. Бо гэта ўжо шовінізм, нікому з людзей працоўных непатрэбны, а наадварот-вельмі людзям шкадлівы. Гэта—спосаб пануючых клясаў нацкаваць на беларускіх гарапашнікаў такіх жа гарапашнікаў-палякоў, ды, карыстаючыся сваркай сярод працоўных, яшчэ больш умацоўваць над аднымі і другімі сваё эканамічнае і палітычнае панаваньне. Калі англіец у Індыі глядзіць на індуса, як на нейкае быдлё і, тымчасам, ані ня брыдзіцца забіраць сабе на ўласнасьць прадукт яго цяжкае працы, дык гэта рэч саўсім дзікая, нялюдзкая. Калі-ж індус ненавідзіць гэтага ангельца, свайго эксплёататара, дык гэта рэч ужо натуральная, свойская чалавечай натуры, бо ніхто свае крыўды сьцярпець ня можа. А калі, скажам, пачне індус ненавідзець проста от так сабе і кожнага гаротніка ангельца за тое толькі, што гэта ня індус, а ангелец, хрысьціянін і г. д., дык тут ужо шовінізм — рэч штучная, ненавісьць павялічаная да нялюдзкае меры цераз пропаведзі свайго індускага духавенства, сваіх царквоў,—гэткіх жа самых эксплёататараў працоўных індусаў, як і англійскі капіталісты.

Эксплёататары ўсіх народаў заўсёды стараюцца паглыбіць нацыянальную розьніцу ў людзях да разьмераў, якія пераходзяць усякае здаровае чалавечае разуменьне; яны стараюцца адвярнуць вочы працоўных масаў ад праўдзівых прычынаў нацыянальнага няшчасьця ды ўсё зваліць на які-нібудзь іншы народ.

Гэтак пры царызьме ў бышай Расеі ўсе беды народныя стараліся выводзіць царскія бюрократы, напрыклад, ад жыдоў.

Гэтак часам і наша „Сялянская Ніва“ стараецца даказаць, што беларусам ў Польшчы блага часткаю і ад таго, напрыклад, што... у Радавай Беларусі бальшавікі надзяляюць безработных жыдоў зямлёю.

Ці-ж можна чалавеку ненавідзець каго-небудзь за тое, што ён працуе? Ведама, што—не. Праца—прыродны дар кожнага жывога арганізму, ня толькі найдасканальнейшага з арганізмаў—чалавека. І толькі людзі дасюль яшчэ не дабіліся такога парадку рэчаў на зямлі, каб кожны мог істнаваць сваею ўласнаю працаю, каб бяз працы гультай ня мог і пражыць коштам свайго працоўнага брата.

І мы павінны, набіраючыся нацыянальнае свае сьвядомасьці, памятаць і аб сьвядомасьці клясавай. Беларусы—народ працоўны, і кожны працаўнік іншае нацыянальнасьці павінен намі шанавацца. Ненавідзячы яго за яго нацыянальную асаблівасьць, мы ўпадаем у шовінізм, згубны, як для нас, так і для яго. Як у яго, так і ў нас—вораг адзін: той, хто нас эксплёатуе.

Я. Малазямельнік.

К Л І Ч.

Гэй, сяляне, да работы:
Скідаць цемры путы!
Годзі жыць сярод цямноты!..
Рвецеся з пакуты!..
Скіньце чорна павучыньне,
Што закрыла вочы, —
Дый змагайцесь нясупына
З зданьнем чорнай ночы!..
Дайце дзеткам кніжку ў рукі,
Гдзе зык роднай мовы...
Хай нясе сьвятло навукі —
Шлях жыцьця ім новы!
Хай іх розум расцьвітае,
Хоць сярод спакусы;
Хай сьвет ведае, хай знае,
Што ёсьць Беларусы!

5./XI. 1926 г. **С. Галыш.**

Беларуская калыханка.

(*Насьледаваньне*).

Ціха ў сялянскай хаце:
Сьпяць усе даўно,
Толькі ўюга вые, плача,
Стукае ў вакно.
А на печы адна маці
Кудзельку прадзе
І над зьвешанай калыскай
Ціханька вядзе:
„Сьпі, мой сынку, сьпі, маленькі“,]
Мой ты родны сын!
Сьпі мой мілы, дарагенькі, —
Ты ў мяне адзін!
Падрасьцеш, — тады пазнаеш,
Што твой старшы брат
Скончыў жыцьцё у вастрозе,—
Бедненькі Ігнат!
Падрасьцеш, — тады пазнаеш
Гора і бяду;
. . . .
. . . .
Па сьлядох Ігнаткі пойдзеш:
Бо яго ты брат;
І закончыш можа тое,
Што пачаў Ігнат.
Барацьбіт будзеш за Волю
І за Родны Край,
Бо радзіўся беларусам, —
Сынку, памятай!
А калі,—так стацца можа, —
Пападзеш ў турму,
Дык канца тады ня будзе
Гору маему!
Буду я тады старая
Плакаць, гараваць;
Але ўжо да сьлёз да горкіх
Мне не прывыкаць.
Сьпі-ж, пакуль яшчэ маленькі,
Мой ты родны сын.
Сьпі мой мілы дарагенькі —
Ты ў мяне адзін!
Сьпі, хоць ўюга вые, дуе,
Плача на двары,
Сьпі: ніхто не арыштуе,
Бо ты йшчэ малы“.

Дзядзька Міхась.

ХРОНІКА.

Трыумф беларускіх клерыкалаў. Як ведама, да восені мінулага году ў Заходняй Беларусі выходзіла толькі адна беларуская часопісь, друкаваная лацінкай — спэцыяльна для ведаючых гэты шрыфт каталікоў. Гэта—„Беларуская Крыніца“. Некалі яна мела характар культурна-нацыянальнага журналу, але ў апошнія гады ўдэрылася ў палітыку і ператварылася ў паскудны клерыкальна чорнасоценскі лісток. Паступовыя беларускія элемэнты стварылі ўвосені 1926 году новы орган—сялянска-работніцкі „Беларускі Звон“, друкаваны, як і „Крыніца“, лацінікай. Аднак, жыцьцё „Звону“ аказалася недаўгавечным: віленскі акружны суд пастанавіў газэту прыпыніць.

Гэтак беларускія клерыкалы могуць трыумфаваць: яны ізноў маюць манаполію—на абдурываньне каталікоў-беларусаў сваей дужа нячыстай „Крыніцай“.

Звальненьне з Вронак сьв. Каўша. Сьледчая ўлада згадзілася зволніць з вастрогу пад залог сьвяшч. Каўша, бухгальтэра Беларускага Каап. Банку ў Вільні, заарыштаванага адначасна з пасламі-грамадаўцамі. Улада вымагае 3.000 злот. залогу.

нейкі гнілы кавалачак хрэва... і сьлязьмі праганяюць яго, каб не засядала ў горле... Убачыўшы свайго татку, яны, як маладыя ластавачкі, разьзявілі свае роцікі, працягнулі ўсе да яго ручкі, худыя і пасохшыя, як каласкі ў полі, і пачалі плакаць і прасіць:

„Татачка дарагі... есьці... есьці хочам... дай кавалачак хлеба... ратуй нас... ратуй маму... яна так-сама памірае... ідзі папрасі ў людзей хоць крошачку хлеба, а як у нас будзе, мы больш ім дадзім... татачка, хочацца есьці... ратуй нас... ратуй“...

І шэсьць худых ручак працягвалася да Габруся, а ён упаў на стол, закрыўся рукавом і пачаў сам плакаць, ня ведаючы сам, што рабіць, куды йсьці, хто паможа яму ратаваць жонку, дзетак і жывёлу...

Вось раптам на печы замяўкаў сумную песьню галодны кот, а ў сенцах, нібы перад вялікім няшчасьцем, завыў сабака. У Габруся сэрца пачало разрывацца ад жалю... Ён хацеў накласьці на сябе рукі, але шкадаваў кідаць жонку й дзетак, хацеў бегчы, але ня ведаў куды і чего?.

А ў хаце ня было ні пылінкі, ні крупінкі.

І вось чуе Габрусь, што ўжо доўгая рука галоднай сьмерці сваімі чорнымі пальцамі адчыняе дзьверы... Ён бачыць, як яна паволі бярэ за шыю яго жонку... як ласкава гладзіць па галоўцы яго дзетак і блізіцца да яго... Габрусь мацней пачынае плакаць, захіляецца шчыльней вопраткаю... Але чуе, што ўжо халодныя пальцы рукі сьмерці бяруць яго за шыю і пачынаюць цiснуць... Ён пачынае вырывацца і з усіх сіл крычыць: „Прэч паганая!... Я ня дамся!...“ ...І раптам прачынаецца...

— Айца, і сына, і сьвятога духа!... — жагнаецца Габрусь і спужана пазірае на ложкі і на печ, дзе і што ён? Ці жыва жонка і дзеткі...

— А... Ды гэта-ж сон!. Божа ласкавы! Няўжо кара мне твая за тое, што я адмовіўся даць хлеба галодным людцам, якія ня ў сьне, а сапраўды паміраюць з голаду?!.

З гэтымі словамі Габрусь саскочыў з ложка, хутка апрануўся і пачаў будзіць жонку...

— Ты жывеш, Адэлька?. Ах, каб ты толькі ведала, які я сёньня бачыў сон! Гэта ўсё грэх мучыў мяне за маю бязьлітасьць і бяздушнасьць...

— Што ты плявузгаеш? адазвалася Адэля, высунуўшы галаву з-пад коўдры... Што гэта? Яшчэ чуць золак, а ты ўжо ўскруціўся? Звар'яцеў, стары, ці што?“

— Эх, баба, баба! Каб ты толькі ведала, колькі я набраўся страху!. Але гэта нічога.. Дзякую табе, божа, што ўсё гэта ў сьне бачыў я, а не сапраўды?. Гэтак-жа можа быць і ў жыцьці сапраўды!. Гэтак-жа мусіць цяпер жывуць і паміраюць там, адкуль даносяцца аж сюды енк і плач гаротнага пакрыўджанага народу... Праўду стары Ахрэм казаў, што ўсё мы пад богам і з усімі гэтак можа стацца... А я больш ня буду такім, якім быў дагэтуль... Я першым унясу ахфяру на дапамогу і аддам усё, толькі пакіну столькі, колькі патрэбна для пражыцьця сямейкі... А можа мой фунцік хлеба выратуе там паміраючага... Я пабягу, Адэлька, скажу старшыні, што першым унясу, колькі змагу...

— Ды што ты, Габрусь, звар'яцеў?

— О, не!... Гэтак ня можна, кабеціна, жыць, як мы жылі... Я хутка вярнуся...

Адэля ад зьдзіўленьня разьзявіла рот і ня ведае, што казаць, калі Габрусь зачыняў за сабою дзьверы...

Яшчэ не пачынала ўсходзіць сонейка, як Габрусь бягом прабег вуліцу і пачаў моцна стукацца ў дзьверы да старшыні вёскі.

Із зборніку („Веснаход). **Міхась Чарот.**

Агідная праца. У маўсцовай расейскай газэтцы „Віл. Утро“ зьявілася заметка аб тым, быццам пратаерэй Беляев, робячы рэвізію Сьніпішскай царквы, дзе настаяцелем быў сьв. Коўш (цяпер сядзіць у Вронках — за тое, што быў бухгальтэрам у Беларускім Каапэратыўным Банку), сцьвярдзіў прапажу царкоўных рызаў, якія былі тым-жа сьв. Беляевым знойдзены ў кватэры сьв. Каўша.. Далей у заметцы пішацца, што той-жа сьв. Беляев зрабіў дакладную рэвізію і ў самай царкве, шукаючы там усюды, ці не схаваў сьв. Коўш чаго — ну зразумела! — нелегальнага. Але-ж вось нё знайшоў нічога...

Запраўды-ж — добры, усердны служака гэты пратаерэй Беляеў...

Гэтую агідную заметку, ведама-ж, падхапіла ўся польская прэса...

Цяпер у тэй-жа газэце „Віл. Утро“ зьмешчана пісьмо ў рэдакцыю старасты Сьніпішскай царквы і групы яе прыхаджан, якія сцьвярджаюць, што ўсе тыя рызы, якія сьв. Беляев лічыў уласнасьцяй царквы, ды якія ён, ня спыніўшыся перад асабістым вобыскам у свайго калегі па ерэйству, знайшоў у яго кватэры, былі асабістай уласнасьцяй сьв. Каўша. Гэтымі рызамі яго жонка дазваляла карыстацца пры багаслужэньні і пасьля арышту яе мужа: пасьля службы рызы кожны раз аднасіліся да яе назад.

Рэдакцыя, не перапрашаючы пакрыўджанага ею сьв. Каўша, сцьвярджае толькі цікаўны факт, што весткі гэтыя былі ўзяты ёй з дакладу благачыннага Беляева, зробленага Віленскай Кансісторыі.

Вось як! — Гэты „благачынны“ Беляев так пасьпяшыў даць у газэту з свайго „дакладу“ весткі, якія ён не праверыў навет у старасты той царквы, якую, пэўна-ж, рэвізаваў (і „рэвідаваў“) у прысутнасьці гэтага старасты... Далёка пойдзе „благачынны“ пратаерэй...

Проці брахні на Беларускі Каапэратыўны Банк. Нягодная брахня, паднятая ў апошнія часы ў газэтах на Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні, быццам ён зьліквідаваны, з мэтаю падарваньня даверыя да яго, а таксама і стэрарызаваньня сяброў Банку, змусіла Управу Банку пацягнуць рэдактароў наступных газэт да адказнасьці за зробленую матэр‘яльную шкоду Банку: „Виленское Утро“, „Dzieńnik Wileński“, „Беларускае Слова“ і „За Свабоду“. Рэдактарам гэтых газэт пагражае кара 6 месяцаў арышту, зг. арт. 540 Кодэксу Карнага.

Дакачаліся. Як ведама, нашы „сельсаюзьнікі із скуры вылазілі, шальмуючы „камуністычную“ Грамаду“. А вось, што цяпер, пасьля разгрому Грамады, піша польская прэса:

„Згодна з пастановамі Камун. Парт. Заходн. Белар.“, блізкі (?) Грамадзе, але дагэтуль яшчэ не зьліквідаваны „Беларускі Сялянскі Саюз“ распачаў энэргічную акцыю па зьбіраньню складак на карысьць пасаджаных у турму камуністычных паслоў“... „Зьбіраньне гэткіх складак, як ведама, вядуць бальшавікі ў Меншчыне. Ужо на апошнім паседжаньні К. П. З. Б. пастаноўлена, каб гэтую акцыю пашырыць і на Зах. Беларусь, аддаючы гэтую акцыю ў рукі „даверанай арганізацыі“. Дык—не памыліліся“.

Піша гэта—„Дзен. Віл.“.

Ведама, што ўсё гэта—бязглуздая брахня: бо ж сельсаюзьнікі і хадэкі найбольш прычыніліся да арыштаў паслоў і разгрому Грамады! Дык страшэнна абураны на гэта паны з „Сялянскай Нівы“... Пачулі смак такой „інфармацыі“ на сабе... — Ня тое, што самім пісаць пра каго іншага...

Афіцыяльны курс грошы на 14 красавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

11./IV на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Лекцыя аб радыё.

Навет у найбольш глухой вёсцы ўжо напэўна ўсе чулі і ведаюць аб істнаваньні гэнага найвялікшага цуду сучаснасьці — аб радыё. Аднак, навет сярод людзей з вышэйшай адукацыяй рэдка знойдзеш чалавека, які мог-бы даць точнае тлумачэньне, што такое радыё.

Тая зацікаўленасьць лекцыяй інж. Трэпкі аб радыё, якая была прачытана ў мінулую нядзелю ў салі Цэнтр. Гуртка Т-ва Бел. Школы ў Вільні, найлепш сьведчыць аб патрэбе папулярызацыі радыё. I грам Трэпка за нейкія дзьве гадзіны даў слухаўшай яго з захапленьнем публіцы яснае прадстаўленьне аб істоце радыё.

Задача лектара была дужа цяжкая: яму прыйшлося даць перадусім паняцьце аб электрычнай тэорыі будовы матэрыі, аб спосабах пашырэньня электро-магнэтных, сьветлавых і гукавых хваляў, пасьля — аб гісторыі шуканьняў і вынаходу спосабаў улаўліваньня гэных хваляў, ды ўрэшце — пазнаёміць слухачоў з найнавейшымі прыладамі радыё фоніі.

Аднак, паважаны лектар вельмі добра справіўся з сваей задачай, — і перапоўненая саля шчыра дзякавала яму за ягоную лекцыю. Асобы, якім не ўдалося быць на лекцыі, зварачаюцца да лекцыйнае сэкцыі Т-ва Бел. Школы з просьбай паўтарыць яе.

Было б вельмі добра, каб лекцыя грам. Трэпкі была распрацована ў асобную кніжачку і гэтак дайшла-бы да нашае вёскі, даючы сялянству высьненьне цуду радыё.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Сканфіскавалі ..

(М. Радашкавічы, Маладэчанскага пав.).

Есьць у нашым мястэчку бібліатэка-чытальня, якую залажыў тут у сёлетнім годзе гурток Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Праўда, многа гэта бібліатэчка мае чытачоў, якія з вялікай ахвотай чытаюць беларускія кніжкі і газэты. Калі на тым тыдні прыйшла ў гэту бібліатэку газэта „Narodny Zwon“ № 9 з 30 сакавіка гэтага году, у якой была зьмешчана карэспандэнцыя пад загалоўкам: „Ксёндз Гадлеўскі адгаварвае людзей ад „Narodnaga Zwonu“, то старшыня гуртка М. Пецюкевіч і скарбнік Вольскі, атрымаўшы яе і прачытаўшы ў ей вышэй упамянёную карэспандэнцыю, вельмі не ўспадабалі. І, доўга не чакаючы, яны абсудзілі гэтую карэспандэнцыю, сканфіскаваць.

Вечарам, калі адзін з сяброў гуртка адчыніў бібліатэку і пачаў адменіваць чытачом кніжкі, то ў бібліатэку прышоў старшыня Пецюкевіч і прынёс гэту газэту з выдзертым рогам.

Убачыўшы, што газэта парваная, адзін з сяброў запытаўся ў яго: „Чаму гэта выдзерта чуць не палавіна газэты“? на гэта Пецюкевіч адказаў яму з дакорам: „Гэта, бачыве, або на пошце няўмысьля адарвалі, або сканфіскавана Камісарам Ураду, бо-ж ведама з Вас кожнаму, што беларускія газэты цяпер часта канфіскуюць“.

Аднак-жа сябры не паверылі яму і, ведаючы, што гэту газэту можна пабачыць у мяне, зьвярнуліся з просьбай.

Увідзеўшы ў мяне газэту цэлай і прачытаўшы гэту карэспандэнцыю, яны вельмі зьдзівіліся на тое, што выробляе іх прэзыдыум гуртка.

Пасьля таго, калі адзін з сяброў упікнуў скарбніку Вольскаму аб гэтай газэце, то ён з павышаным голасам адказаў: „Няхай не зьмяшчаюць усякага глупства“!

Магу яшчэ дабавіць тое, што гэта карэспандэнцыя вельмі кальнула ў душу Пецюкевіча, які зьяўляецца супрацоўнікам ксяндзоўскай „Krynicy“ і ў вялікай пашане да кс. Гадлеўскага.

Ня гонар Вам, беларускія інтэлігенты памагаць Камісару Ураду накладаць канфіскаты на нашы беларускія газэты.

Белакарчанін.

Ганьба бацьком.

(Браслаўскі пав.).

У нашай вёсцы Салакоўшчыне залажыўся Гурток Т-ва Беларускае Школы, дзякуючы высілкам нашае моладзі. Праз нейкісь час адчынілі і бібліатэку-чытальню. Хацелі таксама паставіць спэктакль. Наагул моладзь наша заварушылася і хацела пашырыць працу на культурна-асьветнай ніве. Дык старыкі нашае вёскі паставіліся супроць гэтага, абазвалі нас бязбожнікамі і камуністамі і проста не далі нам працаваць. І так замест таго, каб чытаць газэту ды кніжкі, дзе можна было-бы шмат чаму навучыцца—старыкі нашы пачалі зацягіваць нашу моладзь навет няпоўналетніх, па 14 гадоў, гуляць у карты, і цяпер у гэтай дурной і некарыснай гульні трацяць з імі ўсякую вольную хвіліну. Ёсьць шмат такіх, што навет на грошы гуляюць. Пачынаюць па грошу, каб выйграць на папяросы, а пасьля ўваходзяць у азарт і кідаюцца цэлымі залатоўкамі і гуляюць амаль-што кожную ноч аж да дня. Бацькі гуляюць у карты на грошы і, ведама, гэтым самым даюць вельмі дрэнны прыклад для дзяцей, якія зьбіраюцца каля іх цэлымі кучамі, ня выключаючы навет школьнікаў. Дыму поўная хата і малыя, гледзячы на старых, кураць, бо ўсюды валяюцца акуркі, якія малыя і падбіраюць.

Бацькі: ці-ж вы ня відзіце, што робіце? Гэта-ж вас заела цемната і вы яшчэ стараецеся падтрымаць яе, перашкаджаючы вясьці культурную работу ды кіснучы ў доме ад папярос пры картах. Мала таго, яшчэ і малых хлапцоў да гэтага прывучаеце. Адкуль-жа будзе тады дабро між намі? Вы наракаеце на цяжкае жыцьцё, на неўраджай, на падаткі. А што вы зрабілі дзеля палепшаньня вашага жыцьця? Ці думаеце, што толькі масьлячы карты знойдзеце сабе шчасьце? Каб аддаў лепш тыя грошы, што прайграеш у карты, прап‘еш або пракурыш, на кніжкі, на газэту, на школу, дык і самому была-бы карысьць і дзяцём тваім і ўсім-бы лепш жылося.

Дык адумайцеся, бацькі, што вы робіце!

Сябра.

Шчыры хрыстоў апостал.

(М Парэчча, Горадзенскага пав.).

Як і часта гэта ў нас здараецца, у нашым мястэчку жыхар Б., будучы сам каталіком, мае праваслаўную жонку і траіх праваслаўных-жа дзяцей. Жывуць яны ў супакою ды згодзе, блізу са 20 гадоў і розьніца рэлігіі ніколі не стаяла таму перашкодаю, тым больш, што абодва яны тутэйшыя ўраджэнцы і ні адзін з іх ня мае таго хворага рэлігійнага фанатызму, як гэта, нажаль, нярэдка можна заўважыць на другіх. Але спакусіцель у згодным жыцьці гэных людзей найшоўся ў асобе нашага новага „паважанага“ пробашча ксяндза Хлявінскага. Гэты „апостал“ Хрыста, зайшоўшы першы раз у дом Б. (ходзячы па калядзе), не знайшоў нічаго лепшага, як сеяць разлад і нязгоду ў спакойным жыцьці гэтае сям‘і. Першае, што прышлося пачуць ад свайго „айца духоўнага“ нашай пары — гэта прапазыцыя, перавянчацца ў касьцёлі, бо царкоўны шлюб, узяты за рускіх часаў, „jest nieważny i pan może rzucić żonę“.

Другое, што зьдзівіла нашага пробашча, гэта тое, што жонка і дзеці Б. да гэтае пары не перароблены на каталікоў, ці праўдзівей, не апалячаны. Зрабіць гэта ксёндз запрапанаваў ураз жа. А калі Б. і жонка яго не згадзіліся, то а. Хлявінскі да таго абразіўся, што навет ня ўзяў грошай, гаворачы, што, калі-б пан забіў чалавека, то я прыняў-бы пана да споведзі, а пакуль у пана ў доме будуць не каталікі, то да споведзі пана не магу прыняць. На гэта грам. Б. адказаў, што да споведзі ён ня надта і сьпяшаецца, а за ахвяраваныя для ксяндза грошы, якіх ён ня ўзяў, грам. Б., цяжка ўздыхнуўшы, выпіў пару „службовых“.

Міма волі напрашваецца само пытаньне, ці то для Бога патрэбна такое „стараньне“ айца духоўнага.

„Парэцкі“.

Як працуе Грыц у Ваўкавыскім павеце.

У зьвязку з падходзячымі выбарамі ў Сойм надта запрацавалі ў нас хадэкі. Залажылі свае сэкрэтарыяты ў Ваўкавыску, Саколцы і др. мейсцах, выпушчаючы на вёскі кадры сваіх агітатараў. Сярод іх у нас вядомы, як з партыі „хлопскай“ (так ён ашуківае сялян, ня кажучы праўдзівага свайго занятку), нейкі Грыц. Гэны Грыц, ходзячы па вёсках, зьбірае сходы і, выстаўляючы свой ашуканчы радыкалізм перад несьвядомым сялянствам, — бярэцца за ўсякага роду справы — нібы іх выканаць. Падобным „працаўнікам“, як наш герой, вядомы балячкі вёскі, ён ведае, што вёска патрабуе: зямлі, дзерава на адбудову, зьмяншэньня падаткаў і г. д. I вось ён пад варункам запісацца ў „Польскую Хрысьціянскую Дэмакратыю“, аплаціць за цэлы год складку сяброўскую, ды пара залатовак за „труды“ асабіста даць Грыцу, — „зробіць усё“.

Сяляне, сьцеражыцеся ваўка ў авечай скуры! Задайце сабе пытаньне, што такое хадэкі, — „Chrześćjańska Demokracja“, — чые інтарэсы яна бароніць! Напэўна ня вашыя! Бо ў народ яны пасылаюць падобных Грыцаў, а там у Сойме галасуюць за тое, каб ня даць вам зямлі, каб падаткі плацілі вы, з вас зьдзіраюць апошні кажух, а абшарнікі вінаваты да гэтых часоў 740 мільёнаў маёнткоўага падатку, хадэкі навет хочуць правясьці такі закон аб самаўрадах гмінных і павятовых, каб абшарнікі мелі па некалькі—галасоў — і, чым багацейшы, тым больш.

Памятайце, сяляне, што, хто хоча вам дабра, хто запраўды змагаецца за вашы інтарэсы, той ня толькі праводзіць іх у Сойме, у жыцьцё, але навет не застановіцца ў барацьбе за іх і за Соймам. А робяць гэта толькі арганізацыі з вас самых, арганізацыі сялян і работнікаў, а не паноў і іх служак

Чык-Чык.

ДРУГАЯ КНІЖКА
ілюстраванае часопісі для дзяцей
„ЗАРАНКІ“,
выйдзе з друку 14 га красавіка.
Бясплатна нікому высылацца ня будзе.
Хто жадае „Заранку“ атрымліваць, няхай пасьпяшыць прысласць падпіску.
Падпісная цана 1 злоты на 3 месяцы.
— АСОБНЫ НУМАР 35 ГР. —
Рэдакцыя і Адміністрацыя:
Вільня, Віленская вул. 12—6.

Зьезд Навагрудзкага Вокругу Т-ва Бел. Школы у м. Навагрудку.

3-га красавіка, у нядзелю адбыўся зьезд дэлегатаў Гуртка Т-ва Беларускае Школы, Навагрудзкага пав., дзеля перавыбару Навагрудзкае Акружное Управы. Праца ў Навагрудчыне пашла на столькі ўжо шырака, што Навагрудзкая Акружная Управа ў сваім дасюлешнім вузкім складзе не магла здавольніць усіх патрэб Навагрудчыны.

На зьезд прыбыла да 60 дэлегатаў ад паадзінокіх Гурткоў Т-ва Бел. Школы, раскіненых па ўсім Навагрудзкім павеце.

На парадку дня стаялі такія пытаньні:

1) Справаздача аб працы Акружное Управы;
2) Перавыбары Акружное Управы;
3) Сяброўскія складкі;
4) Арганізацыйныя справы.

Сход адчыніў кароткай прамовай грам. Чатырка, старшыня Акружное Управы, які ў кароткіх словах абрысаваў дзейнасьць Навагрудзкае Акружное Управы за апошні час, пасьля чаго быў выбраны прэзыдыум сходу, за старшыню якога аднагалосна быў выбраны адвакат Спірыд. Ад Галоўнае Управы Т-ва ў Вільні вітаў зьезд старшыня яе грам. Уласаў. Аб працы Галоўнае Управы зрабіў невялічкі даклад працаўнік яе грам. Жыткевіч. З дакладаў выявілася, што ў Навагрудзкім вокругу істнуе ўжо 52 Гурткі Т-ва з 1847 сябрамі, адчынены 24 бібліатэкі, атрымана з месц 15 заяў на адчыненьне Народных Дамоў. На пачатку гэтага году пастаўлена ў Навагрудчыне 14 спэктакляў, арганізаваны адзін струнны аркестр у м. Любчы. Выявілася таксама, што вёска надта цікавіцца рэфэратамі і лекцыямі, многа дзе просяць, каб Акружная Управа паслала адпаведнага рэфэрэнта-лектара, або каб прыслала ўжо гатовую напісаную лекцыю, якую-б у Гуртку прачыталі самі. Выказана было пажаданьне, каб да чытаньня лекцыяў была прыцягнена вясковая інтэлігенцыя і каб пры Гуртках Т-ва былі арганізаваны сэкцыі лектароў, якія-б у першы чарод зьвярнулі ўвагу на ліквідацыю няпісьменнасьці. Дакладчыкі з месц выявілі пажаданьне, каб у м. Навагрудку быў заложаны моцны культурны цэнтр з добрым Народным Домам, з вялікай бібліатэкай і каб абавязкова была заложана ў м. Навагрудку беларуская кнігарня, на што грам. Чатырка адказаў, што пасьпех арганізацыі Народнага Дому і бібліатэкі, як і наагул уся праца Т-ва, залежыць ад ахвярнасьці сяброў яго.

У канцы зьезд вынес наступныя пастановы:

1) Дамагацца, каб Урад адчыніў столькі беларускіх пачатковых школ, на колькі зложана дэклярацыяў;
2) Дамагацца адчыненьня сярэдніх беларускіх школ і ўдзяленьня дапамогі істнуючым ужо беларускім гімназіям;
3) Наданьня публічных правоў істнуючым ўжо беларускім гімназіям і тым, якія будуць адчыняцца;
4) Адчыненьня катэдры беларусазнаўства пры Віленскім Унівэрсытэце.

Навагрудзкая Акружная Управа была дапоўнена новымі сіламі, так што цяпер яна будзе больш працаздольнай і, пэўне-ж, павядзе працу ў Навагрудчыне яшчэ шырэй.

Навагрудчык.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

УВАГА! УВАГА!
ГРАМАДЗЯНЕ! Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы адчыняець у Вільні
Вячэрнія Курсы для дарослых беларусаў.
Праграма курсаў: арытмэтыка, геаграфія, гісторыя, беларуская мова, рысаваньне і архітэктурнае чырчэньне.
Запісь на курсы прыймаець кіраўнік Курсаў сябра Мітрафанаў што-дзень ад 5 да 7 гадзіны ўвечары ў памяшчэньні Курсаў (Новы Сьвет Беларуская народная школа пры Нова Сьвецкай царкве).
Аб пачатку лекцыяў будзе павядомлена ў газэтах.
ГАЛОЎНАЯ УПРАВА.

Выйшла з друку новая кніжка:
ЯКУБ КОЛАС (К. Міцкевіч)
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
Угодкавае выданьне Беларускага Выдавецкага Таварыства.
Пекная кніжка вялікага фармату — на добрай паперы, у цьвердай вокладцы з партрэтам аўтара,—будзе служыць запраўднай аздобай кожнае беларускае хаты.
ЦАНА 2 ЗЛОТЫ.
Выпісывайце і купляйце ў Белар. Кнігарні Т-ва, Вільня, Вострабрамская 1.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.

Bibljoteka w Wilnie